

ХУТКА ДА МІНУС 15. АМАЛЬ ЗІМА
3

ТУТ АДЧУВАЕШ ГОНАР ЗА КРАІНУ
4



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

17 ЛІСТАПАДА 2023 г. ПЯТНІЦА № 223 (30103)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Каштоўныя любыя практыкі, накіраваныя на стварэнне ў насельніцтва культу здаровага ладу жыцця, пачынаючы ад дзіцячага садка, школы, ВНУ, працоўных калектываў. Любыя метады, якія блізкія нашай ментальнасці і не супярэчаць падыходам і нормам заканадаўства, могуць быць задзейнічаны. Важна, каб яны давалі эфект, які дасць магчымасць таксама максімальна выключыць ужыванне спіртных напояў сярод моладзі і дарослых людзей. Скажам, што і каэфіцыент карыснага дзеяння работнікаў без перакуру будзе значна вышэйшы».*

# Мелодыя кроснаў



Фота БелТА.

У Верхнядзвінскім раённым Доме рамёстваў працягваюць традыцыі і адраджаюць нацыянальныя касцюмы. Пераважаюць пакуль жаночыя ўборы, але мясцовыя майстры рукадзелля клапоцяцца аб папаўненні калекцыі. Майстар Таццяна ЦЫРО *(на фота)* цікавіцца многім — габеленапляценнем, саломапляценнем, лепкай з гліны, вышыўкай, карункапляценнем, вязаннем. Але сваім асноўным захапленнем і справай жыцця называе адраджэнне тэхналогій ткацтва на кроснах.

## КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка адобрыў праект пагаднення з Кітаем аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый.**

• Прамвытворчасць у Беларусі ў студзені — кастрычніку вырасла на 8 працэнтаў.

• **У Іўеўскім раёне адкрылі памятны знак легендарнаму партызанскаму спецатраду «Слаўны».**

• Вытворчасць марожанага са слуцкага малака запусцяць у Кітаі.

• **На вуліцах Віцебска пачалі курсіраваць 17 новых аўтобусаў.**

• ДКНТ прапануе стварыць адзіны цэнтр арганізацыі доступу да сусветных электронных інфарэсурсаў.

• **Адбылося адкрыццё памятнага знака ў гонар Мінскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча.**

## Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

# «Мы выходзім на новы ўзровень узаемадзеяння дзяржавы і грамадства»



**Найважнейшай падзеяй палітычнага жыцця краіны ў наступным годзе стануць выбары дэпутатаў усіх узроўняў. Упершыню ў найноўшай гісторыі яны будуць праходзіць па правілах, замацаваных у абноўленай Канстытуцыі 2022 года, — у адзіны дзень галасавання. Як сказаў на нядаўняй сустрэчы з кіраўнікамі палітычных партый Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, «уся вертыкаль улады мабілізавана на правядзенне разумна, прыгожа, дастойна парламенцкіх выбараў, выбараў УНС». Аб актуальных пытаннях будучай электаральнай кампаніі, аб сітуацыі ў краіне і ў свеце, у якой яна будзе праводзіцца, мы гутарым са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ.**

СТАР. 2

## Беражыце сябе!

# Пнеўманія пасля COVID-19 развіваецца ў 3-5 %, пасля грыпу — у 30 %

**Факты для тых, хто сумняваецца, прышчапляцца ці не**

**Звычайна вакцынацыя супраць грыпу робіцца на працягу кастрычніка — лістапада, прыкладна за месяц да разгару грыпу. За гэты час у прышчэпленых фарміруецца ўстойлівы імунітэт. Чаму грып называюць чумой стагоддзя, і чым ён небяспечны? Каму варта прышчапіцца абавязкова? Калі сёлета чакаць сезон грыпу? Якая вакцына найбольш эфектыўная? Гэтыя пытанні мы задалі медыкам.**

### Чым небяспечны грып?

— Сённяя грып — сапраўдная чума стагоддзя. Па ўзроўні ўскладненняў і смяротнасці грып знаходзіцца на трэцім месцы пасля сардэчна-сасудзістых хвароб і ракавых захворванняў, — прыводзіць статыстыку **ўрач-рэабілітолаг, загадчык аддзялення медыцынскай рэабілітацыі 11-й гарадской паліклінікі Мінска Вольга ЯЧЭЙКА.**

Разам з ВРВІ грып займае 95 % сярод інфекцыйных захворванняў. Гэтыя вірусы кожны год інфіцыруюць да 500 мільёнаў чалавек па ўсім свеце. З іх каля двух мільёнаў памірае. Каб скараціць выпадкі смяротнасці, вучоныя рэкамендуюць вакцынацыю.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

23223

9 771990 763008

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



Міжпарламенцкае супрацоўніцтва

# РАЗУМЕЦЬ АДНО АДНАГО СЭРЦАМ

**Парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай прымае ўдзел у мерапрыемствах Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД у Бішкеку.**



На палях Міжпарламенцкай асамблеі ўчора прайшла міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 85-годдзю Жагорку Кенеша (парламента) Кыргызскай Рэспублікі. Выступаючы на ёй, Наталля Качанава адзначыла: «Менавіта ў такія моманты асабліва моцна ўсведамляеш, наколькі глыбокія гістарычныя карані парламентарызму Садружнасці Незалежных Дзяржаў, моцныя традыцыі народаўладдзя ў дзяржавах еўразійскай геапалітычнай прасторы і блізкія па духу нашы краіны і народы».

Гэта тое, што нам перадалося ў спадчыну з часоў, калі кыргызы, беларусы і ўсе савецкія народы жылі ў адной вялікай краіне, якую шанавалі як Радзіму-маці, дзялілі па-братэрску адна з адной радасці і нягоды, разам будавалі планы на будучыню, падкрэсліла спікер. «І тое, што сёння нам удаецца захаваць і прымножыць дзякуючы кіраўнікам нашых дзяржаў і добрым дружалюбным адносінам паміж імі», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

«Асноўныя падыходы нашых краін застаюцца нязменнымі. У цэнтры ўсяго — дзяржаўнага кіравання, палітыкі і грамадскай дзейнасці — чалавек і клопат аб ім. Справядлівасць, сумленнае і адказнае стаўленне да справы, самаахвярнае служэнне свайму народу і сваёй краіне — знак якасці, можна сказаць, брэнд дзяржаў — удзельніц СНД», — дапоўніла Наталля Качанава. Звяртаючыся да парламентарыяў дзяржаў — удзельніц СНД, яна звярнула ўвагу, што «мы разумеем адзін аднаго не толькі розумам, але і сэрцам, мы прадстаўляем народы адной геапалітычнай прасторы і агульнага лёсу. Наша цывілізацыйная місія бачыцца не толькі ў тым, каб абараніць наша адзінства, але і сваім паспяховым прыкладам парламенцкага супрацоўніцтва дэманстраваць усёй сусветнай супольнасці эвалюцыйны шлях развіцця, выступаць фарватарамі прагрэсіўных сіл чалавецтва».

Па-сапраўднаму згуртаваўшыся, парламентарыі краін СНД змогуць дабіцца вялікіх поспехаў для сваіх краін, забяспечыць мір, спакой і бяспеку, паставіць надзейную заслону выклікам сучаснасці, якія апускаюць нашу планету ў атмасферу хаосу і нявызначанасці, адзначыла спікер. «Разам мы зможам адрадзіць дух усеагульнай згоды і гарантаваць цяперашнім і наступным пакаленням права на будучыню», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

У Бішкеку таксама адбылася сустрэча Наталлі Качанавай са старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянцінай Матвіенка. Яны абмеркавалі шэраг пытанняў па развіцці двухбаковых адносін Беларусі і Расіі, адносін у рамках Саюзнай дзяржавы і Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Яшчэ адна двухбаковая сустрэча на палях Асамблеі — з Тарага Жагорку Кенеша Кыргызстана Нурланбекам Шакіевым. Ён запэўніў Наталлю Качанаву ў гатоўнасці кыргызскага боку пашыраць і ўмацоўваць супрацоўніцтва з Беларуссю па ўсіх кірунках узаемадзеяння, адзначыўшы вынікі свайго афіцыйнага візіту ў Беларусь у кастрычніку бягучага года, у ходзе якога ўдалося дасягнуць шэрагу дамоўленасцяў па найбольш важных пытаннях узаемадзеяння. У тым ліку было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж парламентамі дзвюх краін.

Сёння адбудзецца 56-е пленарнае пасяджэнне МПА СНД. Асобная ўвага будзе ўдзелена ролі рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін у СНД. Парламентарыі таксама плануюць разгледзець шэраг мадэльных законапраектаў у сферы экалогіі, бяспекі і права.

**Паводле БелТА.**

# «Мы выходзім на новы ўзровень узаемадзеяння дзяржавы і грамадства»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Уладзімір Паўлавіч, краіна ўступіла ў новы электаральны цыкл. У чым яго асаблівасці і якія адрозненні выбарчай кампаніі 2024 года?***

— Для Беларусі апошні чатырохгадовы перыяд характарызуецца важнымі працэсамі, звязанымі з фарміраваннем новай геапалітычнай карціны свету. Наша краіна знаходзіцца ў эпіцэнтры падзей, і гэта не можа не ўплываць у тым ліку на правядзенне электаральнай кампаніі. Крызіс даверу ў свеце і рост ваеннай напружанасці ў Еўрапейскім рэгіёне; спробы вядучых дзяржаў планеты захаваць уласнае дамінаванне, выкарыстоўваючы для гэтага ўвесь комплекс наяўных сродкаў; штучны разрыў гандлёвых сувязяў і фарміраванне новай «жалезнай заслоны»... Усё гэта накіравана на пагаршэнне жыцця нашых людзей і падрыў эканомікі, рост напружання ўнутры грамадства і стварэнне канфліктнага патэнцыялу. Гэта беларусы ўжо бачаць ва Украіне і спазналі б на сабе, калі б улада не выстаяла ў 2020 годзе.

Не выклікае сумневу, што нас не пакінуць у спакоі, а спробы знешняга ціску на краіну і ўплыву на людзей будуць толькі ўзмацняцца. Эканоміка, фінансы, палітычнае будаўніцтва, духоўнасць і сфера сэнсаў, — усе гэтыя галіны ператвараюцца ў арэны рэальнага супрацьстаяння. Ужо сёння супраць Беларусі вядзецца мэтанакіраваная дэструктыўная дзейнасць, а інфармацыйная кампанія набывае рысы адкрытай канфрантацыі.

Абвінавачванні ў «пагаршэнні сітуацыі з правамі чалавека, падтрымцы агрэсіі Расіі супраць Украіны, арганізацыі нелегальнай міграцыі і дэпартацыі ўкраінскіх дзяцей» — гэта далёка не поўны пералік фэйкавых медыйных укідаў заходніх паліттэхнолагаў для дэманізацыі нашай краіны і яе кіраўніцтва.

Што датычыцца адрозненняў, то ў 2024 годзе ўпершыню будзе праведзены Адзіны дзень галасавання, у рамках якога плануецца выбраць дэпутатаў усіх узроўняў — ад сельскіх і абласных Саветаў да Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У працэс палітычнага будаўніцтва актыўна ўключыліся партыі, якія становяцца рэальнай сілай, здольнай уплываць на працэсы, што адбываюцца ў дзяржаве.

Па сутнасці, ідзе абнаўленне палітычнай сістэмы краіны, мы выходзім на новы ўзровень узаемадзеяння дзяржавы і грамадства. Беларускія грамадзяне ўсвядомілі, што іх пазіцыя — аснова паступальнага развіцця краіны і яе інстытутаў. Горкі вопыт 2020 года пераканаў усе пласты грамадства, што ў свеце нікому не патрэбны канкурэнты, мы самі ствараем уласны лёс, а бяда прыходзіць туды, дзе няма народнага адзінства. Асаблівае значэнне ў гэтых умовах набывае электаральны суверэнітэт.

***— Электаральны суверэнітэт — дастаткова новае паняцце, аднак яно ўжо знайшло адлюстраванне ў праекце Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі краіны, якая абмяркоўваецца цяпер. Што ўключае ў сябе гэта паняцце і як яно ўзаемазвязана з працэсамі, якія адбываюцца ў палітычнай сферы?***

— Суверэнная беларуская дзяржава была створана на аснове сацыялістычных ідэй і базе сацыяльнай роўнасці. Беларусь увесь час падвяргаецца нападкам і крытыцы з боку ідэолагаў заходняга лібералізму за нежаданне станавіцца крайнай-спажыўцом, адмовіцца ад нацыянальнага суверэнітэту ўзамен на прынцыпы глабалізму.

Мы паслядоўна адстойваем сваё права на ўласны шлях развіцця і нацыянальную мадэль ладу, у аснове якой моцная дзяржаўная ўлада, сацыяльна арыентаваная эканоміка, агульначалавечыя каштоўнасці і адзінства народа.

Электаральны суверэнітэт — гэта элемент нацыянальнага суверэнітэту, які ўяўляе сабой неад'емнае і выключнае права дзяржавы самастойна і незалежна арганізоўваць і праводзіць выбары, рэферэндумы дзеля забеспячэння рэалізацыі поўнаўладдзя народа і свабоды яго выбару пры вяршэнстве Канстытуцыі і нацыянальнага заканадаўства, недапушчэння ўмяшання ў выбарчы працэс.

Само жыццё вымушае ўважліва ставіцца да гэтага паняцця. На працягу дзесяцігоддзяў выбарчы працэс выкарыстоўваецца як сродак умяшання ва ўнутраныя справы краін, для змены існуючых палітычных сістэм і вектараў развіцця. Для гэтага задзейнічаюцца напрацоўкі ў сферы тэорыі і практыкі «каляровых рэвалюцый», актыўна эксплуатуюцца праблемы ў нацыянальных заканадаўствах і распальваюцца ўнутраныя супярэчнасці. Не абышла бокам гэтая пошасць і Беларусь.

У сувязі з гэтым уключэнне электаральнага суверэнітэту ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, а таксама замацаванне ў ёй механізмаў яго забеспячэння з'яўляецца надзённай неабходнасцю і патрабаваннем часу. Заканамерна, што ў якасці асноўнага нацыянальнага інтарэсу ў палітычнай сферы вызначана «забеспячэнне ўмоў для рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод грамадзяніна і чалавека», а ўнутранай крыніцай пагрозы — «ажыццяўленне дзеянняў, накіраваных на дыскрэдытацыю або зрыў электаральных кампаній».

Дзяржава павінна быць загадзя гатова да нейтралізацыі пагроз уласнай бяспецы і абароны канстытуцыйных палажэнняў аб тым, што «адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў краіне з'яўляецца народ». Гэта найважнейшы прынцып нацыянальнага народаўладдзя і аснова незалежнага развіцця, якія практычна рэалізуюцца праз забеспячэнне электаральнага суверэнітэту.

Гісторыя сведчыць, што беларусы даказалі сваё права на самастойнае развіццё, засвоілі гістарычныя ўрокі і сутнасць дэмакратычных прынцыпаў. Сёння народаўладдзе — аснова нацыянальнай дзяржаўнасці і беларуская традыцыя, якую мы будзем абараняць усімі даступнымі спосабамі.

***— Кожная выбарчая кампанія — гэта своеасаблівы экзамен для дзяржавы. Улада трымае адказ перад народам і ўласнымі грамадзянамі за перыяд сваёй дзейнасці. З якімі вынікамі мы падыходзім да гэтых выбараў?***

— Беларусь спраўдзілася як сацыяльная дзяржава, унутраная палітыка якой пабудавана на прынцыпах справядлівасці, адказнасці і клопату аб людзях. Збалансаванае размеркаванне сацыяльных даброт і дакладнае выкананне ўладай абавязацельстваў перад грамадствам, бясплатная адукацыя і ахова здароўя, стабільнае пенсіённае забеспячэнне і падтрымка ўразлівых катэгорый грамадзян, эфектыўныя дзяржаўныя інстытуты і развітая прамысловасць, — усё гэта наша сучасная рэальнасць.

На знешнепалітычным вектары Беларусь — суверэнная, незалежная дзяржава, здольная адстойваць нацыянальныя інтарэсы, якая мае для гэтага неабходныя сілы і сродкі. Мінск многія гады з'яўляецца донарам міру, сімвалам стабільнасці і прыкладам няўхільнага выканання абавязацельстваў. Мы паважліва ставімся да інтарэсаў іншых дзяржаў, паслядоўна выступаем за раўнапраўны дыялог. Сёння ў нас ёсць надзейныя саюзнікі і сябры, якія гатовы прыйсці на дапамогу ў цяжкі час.

Усё гэта дазволіла нашай краіне годна прайсці выпрабаванні каранавірусам, санкцыямі, гібрыдным уздзеяннем, накіраваным на пазбаўленне суверэнітэту. Мы выстаялі і захавалі мір на сваёй зямлі, працягнулі развівацца, мінімізаваўшы негатыўныя наступствы для беларускіх грамадзян.

У самыя цяжкія гады краіна не скарацiла сацыяльныя праграмы. Працягвалася будаўніцтва паліклінік, бальніц, школ, дарог, мастоў і жылля. Своечасова выплачваліся зарплаты, пенсіі і дапамогі, функцыянавалі ўстановы культуры і сацыяльнай сферы, транспарт і гандаль. Больш за тое, у 2023 годзе расла эканоміка, забяспечвалася цэнавая і фінансавая стабільнасць, уведзены ў строй другі блок атамнай станцыі, у поўным аб'ёме забяспечаны энергетычная і харчовая бяспека краіны.

Дзяржава жыве і развіваецца, а ўлада дэманструе жыццяздольнасць і эфектыўнасць у самых складаных умовах. Створаная ў краіне сістэма кіравання дазваляе вырашаць задачы, якія стаяць перад ёй, эканоміка і фінансы гнутка адаптуюцца да існуючай рэальнасці і знаходзяць пункты росту. Улада вядзе адкрыты дыялог з народам, не замоўчвае праблемы і не перакладае іх на плечы людзей, прызнае памылкі і аператыўна іх устараняе, найбольш складаныя пытанні выносіць на ўсеагульнае абмеркаванне, па выніках якога прымаюцца канчатковыя рашэнні.

Прамы дыялог фарміруе адзінства народа і ўлады, прымушае ўсвядоміць значнасць суверэнітэту і незалежнасці як асновы нацыянальнай дзяржаўнасці. Ён дае разуменне таго, што народаўладдзе — бясцэннае дасягненне, захаванне якога — найважнейшая задача беларускага грамадства. Пры гэтым трэба кіравацца выключна ўласнымі інтарэсамі і нацыянальным заканадаўствам, не адцягваючыся на выпады ангажаваных «дэмакратычных» заходніх інстытутаў.

Напярэдадні электаральнага перыяду ў дзяржаве праведзена работа па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства, завяршэнні рэфармавання партыйнай сістэмы, стварэнні асноў для далейшага развіцця, забеспячэнні суверэнітэту краіны і адстойванні нацыянальных інтарэсаў у палітычнай сферы. Істотны ўклад у гэта ўнеслі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

***— Суверэнітэт непарыўна звязаны з нацыянальнай бяспекай. У сучасным свеце ні адна дзяржава не застрахавана ад знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы. Ці магчыма такое развіццё абстаноўкі ў Беларусі?***

— Ваяўнічая рыторыка заходніх дзяржаў, канфлікты ў розных кутках свету і наш уласны досвед не выключаюць падобных спроб. Гісторыя сведчыць, што перадвыбарныя кампаніі актыўна выкарыстоўваюцца ў якасці сродку эскалацыі абстаноўкі. Аднак хацелася б яшчэ раз нагадаць, што ў пасланні Прэзідэнта да беларускага народа і парламента ў 2023 годзе размова ішла менавіта аб умовах захавання суверэнітэту і незалежнасці.

У якасці асноўных з іх былі вызначаны: народнае адзінства, гістарычная памяць і нацыянальныя традыцыі, эканоміка, сацыяльная справядлівасць, знешняя палітыка, абараназдольнасць дзяржавы. Усе гэтыя напрамкі пастаянна знаходзяцца ў полі зроку ўлады.

Сёння Беларусь з'яўляецца астраўком стабільнасці і духоўнасці, прыкладам сапраўды дэмакратычнай і палітычна справядлівай дзяржавы. Мы разумеем, што гэта многіх не задавальняе за межамі краіны, а спробы «вярнуць нас на шлях ісціны» будуць працягвацца. У сувязі з гэтым маючая адбыцца электаральная кампанія — чарговая праверка на трываласць беларускага грамадства. Аднак дзяржава мае неабходныя рэсурсы, крэдыт даверу народа і рэальны суверэнітэт. Эксперты сцвярджаюць, што ні адна дзяржава не застрахавана ад знешняга ўмяшання, аднак «бяда прыходзіць туды, дзе ёй людзі самі адчыняюць дзверы», а беларусы добра засвоілі гэтую ісціну.

Не сумняваюся, што выбарчая кампанія пройдзе ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, сумленна і адкрыта, а ў органы ўлады прыйдуць людзі, якія гатовы служыць беларускаму народу.

Толькі народ мае права вырашаць свой лёс, і гэтае рашэнне прымаецца на выбарах большасцю галасоў нашых грамадзян.

Сваіх не кідаем

# САМАЕ КАШТОЎНАЕ — ЛЮДЗІ

**Па даручэнні Прэзідэнта нашай краіны беларускім бокам у кантакце з калегамі з Ізраіля і Егіпта, а таксама пры садзейнічанні Расіі і Катара праведзена работа па арганізацыі выхаду беларускіх грамадзян і членаў іх сем'яў з сектара Газа.**

Учора 43 чалавекі прайшлі праз пагранічны пераход «Рафах» на тэрыторыю Егіпта. Сярод эвакуіраваных шмат дзяцей. На граніцы з сектарам Газа грамадзян Беларусі і членаў іх сем'яў сустрэлі супрацоўнікі КДБ, якія выконвалі даручэнне Прэзідэнта Беларусі па эвакуацыі бежанцаў. «Як сказаў наш кіраўнік дзяржавы, самае дарагое — гэта хлеб, а самае каштоўнае — гэта людзі», — сказаў эвакуіраваным адзін з супрацоўнікаў.

«Трымайцеся! Гэты кашмар ужо ў мінулым!» — такімі словамі падбадзёрвалі беларусаў. — Усе астатнія дробязі — гэта не важна. Усё вырашальна. Усе пытанні будуць вырашацца па меры паступлення».

Увечары гуманітарны рэйс «Белавія», які быў накіраваны з Мінска для эвакуацыі беларускіх грамадзян, прызямліўся ў Каіры. На яго борце прыляцелі і двое медыкаў, і двое псіхолагаў з Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС «ЗУБР» для аказання дапамогі і суправаджэння грамадзян Беларусі, якія эвакуіруюцца з зоны ваеннага канфлікту.

«З сабой бяром неабходнае для аказання амбулаторнай і неадкладнай дапамогі, а таксама абсталяванне для маніторынгу і дыягностыкі захворванняў, — расказаў перад адлётам **галоўны спецыяліст цэнтра медыцынскага прызначэння РАСП «Зубр» Юрый ГЕЛЕКЛІДЗІ**. — У падобных місіях удзельнічаем не ўпершыню, таму задачу кіраўніцтва выканаем у поўным аб'ёме».

Для мінімізацыі магчымых крызісных сітуацый спецыялісты МНС гатовы аказваць экстранную псіхалагічную дапамогу як дарослым, так і дзецям.



Фота АНТ.

*На момант падпісання нумара борт вылецеў з Каіра на Мінск. Як развіваліся падзеі з эвакуацыяй беларускіх грамадзян з Газы — у аператыўным рэжыме на нашым сайце і ў тэлеграм-канале.*

# Пнеўманія пасля COVID-19 развіваецца ў 3-5 %, пасля грыпу — у 30 %

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Прышчэпка дапамагае знізіць захворванне на грып у даволі вялікіх маштабах. Напрыклад, сярод пажылых людзей, якія атрымалі прышчэпку ад грыпу, каля 60 % потым не хварэюць на вострыя рэспіраторныя захворванні наогул. Прышчэпка ад грыпу дае магчымасць не хварэць больш як 80 % людзей усіх узростаў, якія прайшлі вакцынацыю. Дзеці, якія атрымалі прышчэпку ад грыпу, перастаюць хварэць больш як у 92 працэнтах выпадкаў. Прышчэпка ад грыпу таксама зніжае верагоднасць ускладненняў больш як на трэць, адно з самых непрыемных з іх — дзіцячы атыт.

## Калі сёлета чакаць грып?

— Грып у нашай краіне мае пэўную цыклічнасць. Звычайна прыходзіць у лютым і доўжыцца да сярэдзіны сакавіка. Але ў сувязі з тым, што з 2019 года ў свеце пачаў цыркуляваць COVID-19, ён у некаторай ступені памяняў правілы гульні. Напрыклад, летась у Беларусь грып прыйшоў у снежні. Добрая навіна ў тым, што вірус грыпу не толькі лечыцца сучаснымі медыцынскімі прэпаратамі (асельтамівір), але і спецыфічна прафілактуецца (вакцынацыя). Сімптомы грыпу ўсім вядомыя, і ёсць памылка, што ён лёгка праходзіць праз тыдзень, але многія не ведаюць, што ўскладненні грыпу могуць мець цяжкія наступствы для арганізма. Напрыклад, пнеўманія пасля COVID-19 развіваецца ў трохпяці працэнтаў людзей, а вось пасля грыпу — у трыццаці працэнтаў, — расказвае **ўрач-інфекцыяніст 11-й гарадской паліклінікі Мінска Андрэй МАКАРЭВІЧ.**

У ідэале пачаць прышчапляцца трэба ўжо ўлетку. Таму сёння адкладаць вакцынацыю катэгарычна не трэба.

## Каму варта абавязкова прышчапіцца?

Супрацьпаказанняў для вакцынацыі амаль няма, за выключэннем алергіі на бялок і на папярэднюю дозу вакцыны ад грыпу.

— Перш за ўсё, вакцынацыю робяць людзям, якія пакутуюць на хранічныя хваробы органаў дыхання (уключаючы бранхіяльную астму), хворым на сардэчна-сасудзістыя захворванні, асобам з захворваннямі нырак, хранічнай ныркавай недастатковасцю, хворым на цукровы дыябет, усім асобам, старэйшым за 60 гадоў, дзецям, пачынаючы з узросту 6 месяцаў, асобам, якія кантактуюць з груднымі дзецьмі, цяжарным жанчынам, тым, хто часта хварэе на прастудныя захворванні. А таксама дзецям і дарослым, якія перанеслі хіміятэрапію, у тым ліку год таму, работнікам медыцынскіх і школьных устаноў, людзям, якія працуюць у вялікіх калектывах (і дзецям, якія наведваюць дзіцячыя сады, школы), жыхарам інтэрнатаў, камунальных кватэр, дамоў састарэлых, а таксама тым, хто знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі, — пералічвае Вольга Ячэйка.

## Ці можна захварэць ад прышчэпкі?

— Вірус грыпу вельмі заразны і перадаецца паветрана-кропельным шляхам або праз заражаныя паверхні, напрыклад, банкноты, дзвярныя ручкі, выключальнікі святла і іншыя бытавыя прадметы. Грып непакоіць усіх. Нават у «лёгкіх» выпадках могуць быць непрыемныя сімптомы. Вакцынацыя бяспечная! Немагчыма захварэць на грып з-за вакцыны. Вакцына абараняе чалавека ад цяжкіх наступстваў і зніжае рызыку захворвання амаль у два разы. Дзякуючы вакцыне захворванне пераносіцца значна лягчэй, нават калі чалавек усё ж захварэў, цяжар сімптомаў таксама значна зніжаецца. Не кажучы ўжо пра смяротныя зыходы, якіх становіцца амаль у два разы менш пасля масавых вакцынацый, — тлумачыць рэабілітолаг.

## Якая вакцына дзейнічае найлепш?

— Навуковыя эксперыменты, якія праводзіліся на працягу апошніх некалькіх гадоў, паказалі, што, дзякуючы вакцынам, ход хваробы нашмат лягчэйшы ці захворванне не праяўляецца зусім. Акрамя таго, падчас даследаванняў было даказана, што вакцыны пераносяцца чалавекам даволі лёгка, яны добра стымулююць імунную сістэму чалавека, а таксама змяншаюць рызыку ўзнікнення эпідэмій. Сярод самых эфектыўных вакцын прапануюцца «Інфлювак» (Нідэрланды), «Ваксігрып» (Францыя), «Флюваксін» (Кітай). Вакцыны, якія змагаюцца з грыпам, называюцца медыцынскім тэрмінам «трывакцыны». Назва дадзена за іх састаў, у які ўваходзяць антыгены супраць трох самых папулярных і небяспечных вірусаў грыпу, — кажа Вольга Ячэйка.

## Як праводзіцца вакцынацыя?

Вакцына звычайна ўводзіцца ў пляча, у вобласць дэльтападобнай мышцы (гэта верхняя трэць плечавой мышцы). Пасля прышчэпкі нельга мачыць месца ўколу на працягу сутак, паколькі можа ўзнікнуць запаленчая рэакцыя скуры.

## Калі не рэкамендуецца прышчапляцца?

— Паколькі ў вытворчасці вакцыны супраць грыпу часцей за ўсё выкарыстоўваецца курыны бялок ці кансерванты, нельга яе ўводзіць тым людзям, у якіх алергія на гэтыя рэчывы. Нельга прышчапляць супраць грыпу дзяцей ва ўзросце да 6 месяцаў. Не рэкамендуецца прышчапляцца ў перыяд вострага захворвання. Толькі праз месяц пасля выздараўлення, калі ваш стан ацэніць урач, вы можаце атрымаць дазвол на вакцынацыю. Прышчапляцца нельга тым, хто раней вельмі цяжка пераносіў аналагічную прышчэпку. Нельга рабіць вакцыну і тым людзям, якія менш за два тыдні таму перахварэлі на прастуду ці грып, — пералічвае Вольга Ячэйка.

## Якія бываюць ускладненні пасля вакцынацыі?

— Яны дзеляцца на дзве групы — сістэмныя і мясцовыя. Сістэмныя ўскладненні — гэта алергічная рэакцыя ўсяго арганізма, напрыклад, галаўныя болі, затрымка дыхання, збоі ў сардэчным рытме, павышаная тэмпература, скокі артэрыяльнага ціску, болі ў мышцах і суставах, менінгіт і гэтак далей. Мясцовыя ўскладненні пасля вакцыны — гэта збой нейкай адной сістэмы, а не ўсяго арганізма. У такім выпадку могуць быць болі ў горле ці галаўны боль, ці пачырваненне скуры ў месцы ўвядзення вакцыны, ці насмарк, — тлумачыць урач-рэабілітолаг.

## Колькі фарміруецца імунітэт?

— Сярэдні тэрмін фарміравання ўстойлівага імунітэту да грыпу — ад 10 дзён да двух тыдняў. Пры выкананні ўсіх правіл вакцынацыі эфектыўнасць вакцын супраць грыпу — 75—90 %. Кожны год састаў вакцын мяняецца. Характэрнай асаблівасцю віруса грыпу з'яўляецца яго здольнасць да мутацый — змены сваіх уласцівасцяў. Менавіта таму Сусветная арганізацыя аховы здароўя штогод загадзя прагназуе тыповыя ўласцівасці вірусаў грыпу для своечасовай змены саставу вакцын вытворцамі, — кажа Вольга Ячэйка.

## Што яшчэ рабіць, каб не захварэць?

Таму, хто праігнараваў сезонную вакцынацыю ад грыпу, рэкамендуецца выконваць простыя і эфектыўныя парады, каб не захварэць. Напярэдадні магчымай эпідэміі ўрачы раяць актывізаваць ахоўныя сілы арганізма пры дапамозе агульнаўмацавальных мер прафілактыкі.

***1. Вітаміны і мікраэлементы.*** Асабліва важная аскарбінавая кіслата (вітамін С), якая спрыяе павышэнню супраціўляльнасці арганізма. Вітамін С варта ўжываць унутр па 0,5-1 г 1-2 разы на дзень. Акрамя таго, ешце як мага больш садавіны і агародніны. Не трэба забываць, што вялікая колькасць вітаміну С змяшчаецца ў соку квашанай капусты, а таксама цытрусавых — лімонах, ківі, мандарынах, апельсінах, грэйпфрутах.

***2. Загартоўванне*** — найважнейшы метад прафілактыкі розных прастудных захворванняў у нашым клімаце. Яно дазваляе нармалізаваць функцыю дыхальных шляхоў пры астуджэнні, што змяншае дозу віруса, які трапляе ў арганізм пры заражэнні. Таму шляхам загартоўвання можна калі не цалкам пазбегнуць прастуды, то зменшыць адчувальнасць да яе. Важна ўсведамляць, што мерапрыемствы па загартоўванні павінны праводзіцца штодня і працягла, гэта павінна быць ладам жыцця.

***3.*** Неабходна ***пазбягаць стрэсаў, ператамленняў і прастуд.*** Калі вы сур'ёзна перагружаеце свой арганізм фізічнай ці разумовай працай, знаходзіцеся ў стане стрэсу ці дэпрэсіі, то ваш імунітэт аслаблены, а значыць, вы даяце магчымасць вірусу з лёгкасцю асталявацца ў вашым арганізме.

***4. Народныя сродкі.*** Меркаванне ўрачоў такое: «Грып — не тая хвароба, якую можна вылечыць самому часнаком і парай над бульбай». Народныя сродкі можна выкарыстоўваць паралельна, як дадатковае лячэнне.

Для прадухілення распаўсюджвання такіх рэспіраторных хвароб, як грып, неабходна прытрымлівацца звычайных мер паўсядзённай гігіены:

- Прыкрываць нос і рот папяровай сурвэткай падчас кашлю ці чхання. Выкарыстаную сурвэтку выкідваць у смецце.
- Старанна і часта мыць рукі вадой з мылам, асабліва пасля кашлю ці чхання.
- Не дакранацца да вачэй, носа ці рота. Інфекцыя перадаецца менавіта такім спосабам.
- Імкнуцца пазбягаць блізкага кантакту з хворымі людзьмі.
- Пазбягаць месцаў збору людзей.

І калі ўсё ж пазбегнуць грыпу ці іншага ВРІ не ўдалося, то не варта займацца самалячэннем. Неабходна звяртацца да спецыялістаў, усе прэпараты прымяняць толькі па прызначэнні ўрача і ні ў якім разе не пераносіць інфекцыю на нагах! Гэта небяспечна для хворага і з'яўляецца рызыкай распаўсюджвання віруса.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# Ноччу падмарозіць і выпадзе «жывы» снег

## На наступным тыдні пры праясненнях — да мінус 15

**Да сярэдзіны лістапада ў нас захоўвалася адносна цёплае надвор'е, але ўжо ў найбліжэйшы час халодны паўночны вецер прынясе дыханне зімы. У ападках пачне пераважаць снег, мокры снег, а тэмпература паветра ўсё часцей будзе апускацца да адмоўных значэнняў. Пры гэтым начныя маразы будуць станавіцца ўсё больш адчувальнымі, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А ў суботу надвор'е ў краіне будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравалася ў халоднай паветранай масе. У гэты дзень толькі па паўднёвым захадзе краіны адаб'ецца ўплыў малаактыўнага франтальнага раздзелу. Будзе воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаецца слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер усходні, паўночна-ўсходні ўмераны, па паўднёвым захадзе парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе апускацца да плюс 1 градуса — мінус 6 градусаў, а па паўночным усходзе краіны да 9 марозу. Максімальная тэмпература днём будзе ад мінус 4 градусаў да плюс 3 градусаў.

У нядзелю нас чакае праверка холадам. Неба будзе яснае, таму што ў асноўным захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Воблачна з праясненнямі. Пераважна без ападкаў, толькі днём па паўднёвым захадзе краіны месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі, у асноўным снег і мокры снег. У паўднёва-заходніх раёнах краіны чакаюцца слабы туман і галалёд. На дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер няўстойлівы ўмераны. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 марозу па паўднёвым захадзе краіны да мінус 12 градусаў па ўсходзе Беларусі, максімальная днём ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

У панядзелак і аўторак пераважна па заходняй частцы краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу з дажджом. Месцамі згусціцца туман, утворыцца галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература апусціцца да мінус 3—10 градусаў, пры праясненнях — да мінус 15. Днём слупок тэрмометра пакажа мінус 1—8 градусаў. Па паўднёвым захадзе ноччу чакаецца мінус 2 — плюс 4, а днём ад нуля да плюс 6 градусаў.

У сераду месцамі па краіне прагназуецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы сіноптыкі абяцаюць мінус 3—10 градусаў, а пры праясненнях — да 15 марозу. Днём будзе мінус 1—8 градусаў. Амаль зіма. Пабачым.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Спажывец

# НАДЫХОДЗІЦЬ ЭРА МАРКЕТПЛЭЙСАЎ

## Што чакае рынак найбуйнейшых гандлёвых анлайн-платформаў



**Гаворка ў нашым выпадку ідзе аб гандлёвых пляцоўках, або маркетплэйсах. Гэта анлайн-платформы для продажу і куплі тавараў і паслуг праз інтэрнэт. Прасцімі словамі, прадаўцы размяшчаюць свае тавары, пакупнікі выбіраюць варыянты, якія іх задавальняюць па цэнах, характарыстыках і іншых параметрах. Аднак самі маркетплэйсы нічога не прадаюць, іх задачы — забяспечваць прасоўванне тавараў, прыцягваць трафік, рабіць сайт і пошук тавараў зручнымі і такім чынам павялічваць продаж прадпрымальнікам.**
**Пра тое, што чакае рынак буйных маркетплэйсаў, паслугамі якіх актыўна карыстаюцца беларусы, мы спыталі ў эксперта і дырэктара кампаніі — правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслава СЕНІНА.**

Наш спікер абраў чатыры кірункі развіцця найбуйнейшых сусветных гандлёвых пляцовак, сфера дзейнасці якіх будзе распаўсюджвацца і на тэрыторыю нашай краіны.

**Самым важным кірункам** стане гнуткае «пашырэнне геаграфіі прысутнасці». Сапраўды, маркетплэйсы будуць імкнуцца выходзіць на новыя рынкі, асабліва ў краінах, якія развіваюцца, дзе ёсць вялікі патэнцыял росту інтэрнэт-пакупак. Для гэтага яны будуць адаптаваць свае платформы да мясцовых законаў, культуры, валюты і мовы, а таксама супрацоўнічаць з мясцовымі партнёрамі па лагістыцы, аплаце і дастаўцы.

**На другім месцы** стане тэма паляпшэння якасці сэрвісу. Маркетплэйсы будуць інвеставаць у развіццё сваіх тэхналогій, каб павысіць хуткасць, зручнасць і надзейнасць сваіх сэрвісаў. Яны будуць выкарыстоўваць штучны інтэлект, машыннае навучанне, блокчэйн і іншыя інавацыі для аналізу даных, персаналізацыі прапаноў і аптымізацыі цэнаў. Досыць актуальнай стане гэтая тэма пры распрацоўцы сучасных метадаў кіравання грашовымі патокамі, якія будуць амаль на 100 працэнтаў выключаць ашуканскія схемы. Схема кіравання інвентаром і аўтаматызацыя працэсаў будуць аптымальна распрацаваны.

**Трэцяй тэмай** развіцця будзе разнастайнасць прапаноў. Гандлёвыя пляцоўкі стануць пашыраць свой асартымент тавараў і паслуг, каб задаволіць усе патрэбы сваіх кліентаў. Яны будуць дадаваць новыя катэгорыі, такія як прадукты харчавання, лічбавыя тавары, падпіскі, адукацыю і іншыя.

Асаблівa варта спыніцца на прадуктах харчавання. Запыт спажыўцоў на анлайн-пакупкі сфарміраваў новы трэнд развіцця для рынку фермерскай прадукцыі — на маркетплэйсы прыйшлі вытворцы прадуктаў харчавання, характэрнымі якасцямі якіх з'яўляюцца экалагічнасць і арганічны цыкл вытворчасці.

Напрыклад, у Расіі рэалізацыя харчовай прадукцыі анлайн лічыцца больш экалагічнай: пры продажы тавараў на маркетплэйсах вытворцы рэгулююць збытавы ланцуг самастойна і падладжваюць прапанову пад попыт, мінімізуючы страты пры захоўванні.

Адным са значных этапаў работы пляцовак анлайн-продажаў з'яўляецца дастаўка. Імкнучыся пашырыць кліенцкую аўдыторыю за кошт няўхільнага росту попыту на якаснае і хуткае абслугоўванне, вытворцы і маркетплэйсы мадэрнізуюць лагістычныя схемы, робячы дастаўку не толькі зручнай, але і экалагічнай. У Расіі ў апошнія пяць гадоў актыўна развіваецца дастаўка з нулявым вуглярodным следам: гэта кур'еры на веласіпедах і пешыя кур'еры. Кампенсуе негатыўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе таксама дастаўка ў пункты самавывазу, каля 65 працэнтаў заказаў маркетплэйсаў пакупнікі забіраюць самастойна.

Развіццё анлайн-продажаў фермерскай прадукцыі на платформах па продажы прадуктаў харчавання або спецыялізаваных фермерскіх маркетплэйсах дае сельгасвытворцам шэраг перавaг: прамы выхад на пакупніка, эканомію на выкарыстанні складскіх памяшканняў, а таксама на лагістыцы, маркетынгу і дастаўцы. Для маркетплэйсаў гэта магчымасць пашырыць асартымент за кошт унікальных свежых і якасных тавараў.

Па разнастайнасці прапаноў гандлёвыя пляцоўкі таксама будуць падтрымліваць розныя фарматы продажу, такія як аўкцыёны, групавыя пакупкі, другасны рынак і іншыя. Дарэчы, міждзяржаўнымі гандлёвымі пляцоўкамі ўжо цяпер актыўна карыстаюцца прадаўцы другаснага рынку жылля асноўных рэгіёнаў Кіпра. Дастаткова ў сваім сотавым тэлефоне адзін раз зрабіць запыт на падобную тэматыку — мінімум раз на тыдзень вы будзеце атрымліваць свежую інфармацыю аб жыллі на продаж у гэтай краіне.

**Чацвёртым кірункам** выступае сацыяльная адказнасць. Маркетплэйсы будуць улічваць уплыў сваёй дзейнасці на навакольнае асяроддзе і грамадства. Яны стануць прымяняць прынцыпы ўстойлівага развіцця, такія як экалагічнасць упакоўкі і дастаўкі, падтрымка малога і сярэдняга бізнесу, абарона правоў спажыўцоў і прадаўцоў, дабрачыннасць і іншыя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «ГОНАР АДЧУВАЕШ ЗА НАШУ КРАІНУ»

## Удзельнікі экскурсіі ў Палац Незалежнасці падзяліліся ўражаннямі

**Палац Незалежнасці чарговы раз гасцінна расчыніў свае дзверы для экскурсій. У сераду іх прайшло ажно дзве. У першай палове дня рэзідэнцыю Прэзідэнта наведалі прадстаўнікі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. А ў другой — работнікі прадпрыемстваў «Малочны свет» і «Малочны гасцінец».**

Гасцям выдалася ўнікальная магчымасць убачыць Палац Незалежнасці не толькі звонку, але і знутры, прайсціся па яго залах і даведацца шмат цікавага пра гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў гэтых сценах.

Гродзенскае прадпрыемства «Малочны свет» сёлета ў лістападзе адзначыла 85-гадовы юбілей. І вось да круглай даты і да Дня работніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці яго работнікі ўпершыню атрымалі запаветнае запрашэнне на экскурсію.

— Чаканні — «вау»! — дзеліцца ўражаннямі яшчэ да пачатку экскурсіі **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і сацыяльна-бытавых пытаннях ААТ «Малочны свет» Ігар НАВІЦКІ**. — Уражанні, думаю, будуць яшчэ больш грандыёзныя, калі пачуем, як Палац будаваўся, паглядзім на залы, у якіх прымаюцца важныя рашэнні, убачым, якія падарункі атрымлівае Прэзідэнт...

Думкамі таксама падзяліўся і **галоўны інжынер прадпрыемства Юрый ШАПЕЛЬ**:

— Мусіць, кожнаму беларусу вельмі цікава пабываць у такім знакавым месцы, дзе адбываюцца гістарычныя падзеі. Мне ў большай ступені цікавы інтэр'ер памяшкання, таму што вельмі шмат можна запазычыць. Ведаю, што тут пры будаўніцтве ў асноўным выкарыстоўваліся беларускія матэрыялы, працавалі менавіта беларускія спецыялісты, таму цікава паглядзець, як жа гэта зроблена, і пацвердзіць для сябе, што мы можам рабіць не горш за сусветныя брэнды.



Сапраўды, тое, што Палац Незалежнасці быў пабудаваны беларусамі, — не проста факт, а адзін з фундаментальных прынцыпаў канцэпцыі збудавання. Для будаўнікоў у той час гэта было сапраўдным выклікам. Бо да гэтага аб'екты такіх маштабаў у краіне не ўзводзіліся.

Так, рашэнне аб будаўніцтве будынка было прынята ў 2011 годзе, і замест запланаваных 58 месяцаў ён быў узведзены ўсяго за 30! Сёлета Палац Незалежнасці адзначае свой 10-гадовы юбілей.

Трохузроўневы будынак у стылі постмадэрнізму, інтэр'еры ў класічным стылі і нязменныя нацыянальныя матывы, якія чырвонай ніткай праходзяць праз усю канцэпцыю Палаца. Гэта не можа пакінуць абыякавым.

— Уразіла ўсё! — расказвае **начальнік планавага эканамічнага аддзела ДП «Малочны гасцінец» Кацярына БАБРУШКА** пасля заканчэння экскурсіі. — Кожная зала па-свойму цікавая, грандыёзная. Разумеючы маштабы таго, якія тут праходзяць перагаворы і якія прымаюцца рашэнні, вядома, дух займае. Вельмі ўсё годна. Адчуваеш гонар за нашу краіну, за нашых людзей, якія ўсё змаглі пабудаваць.

Гэтым разам Палац на свае вочы ўбачылі каля двухсот чалавек. На памяць у іх застанецца добры настрой, а яшчэ — цэлы багаж новых уражанняў і ведаў.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**



# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сі Цзіньпін на сустрэчы з Байдэнам адзначыў, што супрацьстаянне паміж Кітаем і ЗША прывядзе да невыносных наступстваў



Старшыня КНР Сі Цзіньпін сустрэўся з прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам у Каліфорніі, паведаміла ТАСС. Перагаворы прайшлі ў маёнтку Філолі каля Сан-Францыска. Кітайскі лідар адзначыў, што адносіны дзвюх краін працякаюць не гладка. Па словах Сі Цзіньпіна, за апошнія 50 гадоў адносіны паміж Кітаем і ЗША ніколі не былі ідэальнымі і заўсёды назіраліся тыя ці іншыя праблемы. Ён адзначыў, што саперніцтва паміж дзвюма вядучымі дзяржавамі не адпавядае духу часу і не дае магчымасці вырашаць праблемы двухбаковага і глабальнага характару, з якімі сутыкаюцца краіны. Як удакладніў Старшыня КНР, краіны змогуць пераадолець існуючыя рознагалоссі, калі будуць праяўляць узаемную павагу і імкнуцца да міру і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Супрацьстаянне паміж Кітаем і Злучанымі Штатамі прывядзе да невыносных наступстваў для ўсіх, заявіў Сі Цзіньпін. Як удакладніў кітайскі лідар, такія буйныя дзяржавы, як Кітай і Злучаныя Штаты, у прынцыпе не могуць спыніць узаемадзеянне. «А спрабаваць змяніць адзін аднаго было б непрактычна», — дадаў ён. Сі Цзіньпін выказаў упэўненасць у пасляховай будучыні двухбаковых адносін, нягледзячы на адрозненні ў культуры і спецыфіку.

## Улады Індыі ўвялі забарону на ўезд дызельных машын у Нью-Дэлі

Пры гэтым адзначаецца, што, нягледзячы на ўвядзенне забароны на ўезд дызельных аўтамабіляў у сталіцу для аднаўлення якасці паветра, жыхары працягваюць карыстацца ўсімі відамі транспарту, паведамляе Hindustan Times. Якасць паветра ў Нью-Дэлі застаецца ў межах «цяжкага» дыяпазону на фоне неспрыяльных метэаралагічных умоў і нізкай хуткасці ветру. Сінопт ыкі адзначаюць, што людзі, якія жывуць у сталічным рэгіёне, наўрад ці найбліжэйшым часам адчуюць палёгку. Акрамя абмежавання руху транспарту, улады прымаюць і іншыя часовыя меры: грузавікі пажарнай службы Дэлі паліваюць вадой 13 гарачых пунктаў, каб знізіць узровень забруджвальных рэчываў. Днямі 24 з 35 гарадскіх манітораў якасці паветра, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Камітэта па кантролі над забруджваннем Нью-Дэлі, адключыліся і перасталі выдаваць даныя, што пагоршыла магчымасць сталіцы рэагаваць на забруджванне.

## Вярхоўны суд Вялікабрытаніі заблакіраваў план урада па высылцы бежанцаў у Руанду

Суддзі прыйшлі да высновы, што гэтую афрыканскую краіну нельга лічыць бяспечнай для адпраўкі просьбітаў прытулку, як сцвярджае брытанскі ўрад. Як паведаміла «Бі-бі-сі», гэта быў дарагі і публічны правал для трох прэм'ер-міністраў запар. Вялікабрытанія заплаціла ўраду Руанды 140 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў ($177 млн), каб ён падтрымаў гэтую прапанову. Тэлеканал Sky News назваў гэты вердыкт «велізарным ударам» па брытанскім урадзе, які з мінулага года спрабаваў пачаць адпраўляць бежанцаў у афрыканскую краіну, патрацўшы на гэта мільёны фунтаў стэрлінгаў. Прэм'ер-міністр Рышы Сунак даў абяцанне справіцца з міграцыйным крызісам, называючы высылку мігрантаў у Руанду адным з важных складнікаў свайго плана.

Сядзі і глядзі

# Культурныя падзеі — на тэлеэкране

**Тэлеканал «Беларусь 3» запрашае на культурныя выхадныя 18 і 19 лістапада. Гэтымі днямі сацыякультурны канал пакажа тэлеверсіі дзвюх галоўных падзей у кінематаграфічным і тэатральным жыцці краіны.**

Восень — традыцыйны час падводзіць вынікі і адзначаць лепшыя дасягненні ў розных галінах грамадскага жыцця. У тым ліку — у сферы культуры і мастацтва. Так, XXIX Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» пад слоганам «Ствараем будучыню» зноў з 14 да 24 лістапада збірае ў беларускай сталіцы найлепшыя ігравыя і дакументальныя стужкі з розных краін, знакамітых кінамайстроў і маладых амбіцыёзных аўтараў. Усяго ж эксперты абралі для паказу ў рамках праграмы амаль 80 работ з больш чым дзвюх тысяч заявак. Цырымонію ўрачыстага адкрыцця форуму ў «Доме кіно» тэлеканал «Беларусь 3» пакажа ў суботу 18 лістапада ў 21.05. Адразу пасля ў 21.55 гледачоў чакае нацыянальная кінапрэм'ера года — стужка «На другім беразе» вытворчасці студыі «Беларусьфільм». А цырымонію закрыцця ў ўзнагароджання пераможцаў міжнароднага кінафоруму тэлеканал пакажа 25 лістапада ў 21.05.

Таксама гэтымі днямі падводзіць вынікі і VII Рэспубліканскі конкурс тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» і адзначае найлепшыя пастаноўкі беларускіх тэатраў. Сёлета ў конкурсцкай праграме прымаюць удзел 32 спектаклі ад 20 тэатраў Мінска, Брэста, Гомеля, Гродна, Маладзечна, Слоніма, Віцебска, Магілёва. Аб выніках самай значнай падзеі ў тэатральным жыцці краіны гледачы даведаюцца падчас тэлеверсіі ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу ў нядзелю 19 лістапада ў 21.05.

А больш падрабязна пра гэтыя і іншыя падзеі можна заўсёды даведацца ў сюжэтах карэспандэнтаў праграмы «Навіны культуры» і рэпартажах праекта «Культурны тыдзень».

**Алена ДРАПКО.**

# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 185

Задачу, якую прапануем для рашэння сёння, склаў шахматыст з Ганцавіцкага раёна Аляксандр Мышкавец *(гл. дыяграму)*. Працаўнік аграпрамысловай сферы, ён захапіўся шахматнай кампазіцыяй, калі служыў у арміі. Апублікаваў больш за 60 задач.




**Белыя:** Kpf3, Фd2, Ke5, Kg5 (4).
**Чорныя:** Kph6, пп. g7, h5 (3).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску прайшоў традыцыйны міжнародны турнір, які сабраў 173 шахматысты з шасці краін, у тым ліку 18 гросмайстраў, 2 міжнародных майстроў, 10 майстроў FIDE. У выніку 1–2-е месцы падзялілі гросмайстры Андрэй Гаравец (Беларусь) і Мікіта Афанасьеў (Расія) — па 7,5 бала з 9. 3–7-е месцы занялі гросмайстры Міхаіл Мажараў, Аляксей Прыдарожны, Дзмітрый Фральянаў (Расія) і Міхеіл Кекелідзэ (Грузія), майстар FIDE Максім Царук (Беларусь) — па 7 балаў. Сярод тых, хто падзяліў 8–16-е месцы (па 6,5 бала), — беларускія шахматысты Аляксей Аляксандраў, Аляксей Краміч, Міхей Навуменка, Вячаслаў Зарубіцкі, а таксама экс-чэмпіён свету па версіі FIDE Аляксандр Халіфман (Расія). Па 6 балаў на рахунку беларускіх гросмайстраў Міхаіла Нікіценкі і Аляксея Фёдарава. Сярод жанчын найлепшы вынік паказала Ксенія Норман.

Прапануем вашай увазе некалькі партый.

Іван Папоў — Андрэй Гаравец. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. e5 c5 4. c3 Kc6 5. Kf3 Kh6 6. C:h6 gh 7. Cb5 Фb6 8. Фe2 Cd7 9. dc Ф:c5 10. 0-0 Cg7 11. b4 Фb6 12. a4 Фc7 13. C:c6 Ф:c6 14. Лa3 0-0 15. Kbd2 a5 16. b5 Фc5 17. Лb3 Лac8 18. c4 Лfd8 19. cd ed 20. Лd3 Cf5 21. Лd4 Фc3 22. Лe1 h5 23. h3 Cg6 24. Лd1 Фc2 25. Фe1 Cf8 26. e6 fe 27. Ф:e6+ Cf7 28. Фe2 Лe8 29. Фf1 Cg7 30. Лf4 Ch6 31. Лd4 Cg7 32. Лf4 Cg6 33. Kph1 Фc7 34. g3 Фc3 35. Kb1 Фb2 36. Kbd2 Лc2 37. Kph2 Фc3 38. Лe1 Лf8 39. Л:f8+ C:f8 40. Лe3 Фb2 41. Фe1 Фc1 42. Ф:c1 Л:c1 43. Лe5 Cf7 44. Kg5 Лc2 45. K:f7 Л:d2 46. Лf5 Cc5 47. Kd8 C:f2 48. K:b7 Kpg7 49. Kpg2 Cb6+ 50. Kpf1 Лd4 51. Л:h5 Л:a4 52. Л:d5 Лb4 53. Kc5 a4 54. Kd7 a3 55. K:b6 Лb1+ 56. Kpf2 a2 57. Лd7+ Kpg6 58. Лa7 a1Ф 59. Л:a1 Л:a1 60. Kd5 Kpf5 61. g4+ Kpe5 62. Ke3 Kpe4 63. Kc4 Лa4 64. Kd6+ Kpf4 65. b6 Лa2+ 66. Kpe1 Лb2 67. b7 Kpg3 68. Kpd1 Kp:h3 69. g5 Kpg4 70. Kpc1 Лb6 71. Kpc2 Kp:g5 72. Kpc3 h5 73. Kpc4 h4 74. Kpc5 Л:b7 75. K:b7 h3 76. Kd6 Kpf4, 0:1.

Аляксей Грыгаровіч — Аляксей Фёдараў. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. Kf3 0-0 6. Ce2 Cg4 7. Ce3 Kfd7 8. Kg1 C:e2 9. Kg:e2 c5 10. 0-0 cd 11. K:d4 Kc6 12. b3 Фa5 13. Лc1 Kc5 14. f3 Лfe8 15. K:c6 bc 16. Фd2 Фb4 17. Cd4 C:d4+ 18. Ф:d4 a5 19. Лf2 a4 20. K:a4 K:a4 21. ba Л:a4 22. e5 d5 23. Фd2 Ф:d2 24. Л:d2 e6 25. cd cd 26. Лb2 Лea8 27. Лcc2 h5 28. g3 g5 29. Kpg2 Kpg7 30. h3 Kpg6 31. g4 h4 32. Лe2 Лa3 33. Kpf2 Kpg7 34. Kpg2 Л8a7 35. Kpf2 Л7a4 36. Лbc2 Лa6 37. Лb2 Kpg6 38. Лbc2 f6 39. Лb2 Лc3 40. ef Kp:f6 41. Лb8 Лca3 42. Лf8+ Kpg7 43. Лe8 Kpf7 44. Лh8 Л:a2, 0:1.

* * *

На Мемарыяле М. Чыгорына ў Санкт-Пецярбургу (212 удзельнікаў) Аляксей Аляксандраў заняў 5-е месца, Аляксей Фёдараў — 10-е. У казахстанскім Паўлады (86 гульцоў) Міхаіл Нікіценка быў другі, Вячаслаў Зарубіцкі — шаснаццаты. Дзяніс Лазавік у моцным турніры на востраве Мэн (Велікабрытанія) заняў 80-е месца са 114.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Kg4! Не вядзе да мэты: 1. Kp:b6? g4! або 1. Cg4? Kpd4! Правільна адказалі Барыс Маркін, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Анонс

# ПРА ШТО РАСКАЖА ЛІСТАПАДАЎСКІ НУМАР «АЛЕСІ»




## «ЗА СВАЮ СПРАВУ СТАЮ ГАРОЙ»

У пастаяннай рубрыцы часопіса **«Жаночая сіла: змяняць, ствараючы»** сваімі дасягненнямі, жыццёвымі прынцыпамі і сакрэтамі поспеху дзеліцца кіраўнік Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі, старшыня арганізацыі Беларускага саюза жанчын Цэнтральнага раёна сталіцы **Надзея Вялікая**.

— Быць лідарам няпроста, — прызнаецца Надзея Міхайлаўна. — Пасада патрабуе вытрымкі, мудрасці, пэўных стратэгій і тактык. Мае прынцыпы: трэба любіць сваю працу, якасна выконваць службовыя абавязкі, рухацца наперад і не падводзіць іншых людзей.

А на пытанне пра сакрэты свайго жыццёвага поспеху Надзея Вялікая адказала так:

— Імкнуся ніколі не маркоціцца і не здавацца. Трэба быць удзячнай за тое, што маеш, і рухацца наперад. Яшчэ важна — нікому не зайздросціць. Шчыра радуюся, калі бачу, як заахвочваюцца заслугі і дасягненні маіх калег. Вучуся ў тых, хто ўмее нешта рабіць лепш за мяне.

## МЕЛОДЫЯ КАХАННЯ

«Я не ўяўляю жыцця без Бога, сям'і і музыкі», — кажа пра сябе кампазітар **Аліна Безянсон**. У гэтай трыядзе — яе формула шчасця і пастаянная крыніца натхнення. Як і калі знайшла свой шлях у жыцці, сваё прызванне, як пазнаёмілася з мужам, якіх вучняў асабліва любіць, чаму ў прафесію кампазітара прыходзіць усё больш жанчын, — пра ўсё гэта Аліна Іванаўна расказала ў інтэрв'ю «Алесі».

## «ЁСЦЬ МЭТА — НЯМА ПЕРАШКОД»

Нядаўна з дапамогай Беларускага саюза жанчын і кіраўніцтва «Беларусбанка» ў маладой мастачкі **Марыі Прахаровіч** адбылася першая персанальная выстава. Нягледзячы на цяжкае захворваннне — спінальную мышачную атрафію, дзяўчына ажыццяўляе свае мары і не збіраецца адступаць і спыняцца.

— Мой дэвіз: «Ёсць мэта — няма перашкод», — кажа Марыя. — Вельмі дапамагае вера ў Бога. Веру, што гэта мой шлях і мне трэба яго прайсці. Выпрабаванні ніколі не даюцца складаней за нашы сілы. Значыць, я проста вельмі моцны чалавек. Дапамагае сям'я, у ёй я чэрпаю бязмежную падтрымку і любоў.

## У ЯКІХ МАМ ВЫРАСТАЮЦЬ ШЧАСЛІВЫЯ ДОЧКІ

Кожная дзяўчынка пераканана: яе матуля — самая лепшая. Але праходзіць час, і нярэдка дарослыя жанчыны адчуваюць у адносінах да сваіх мам гаму супярэчлівых, «непапулярных» пачуццяў. Чаму так адбываецца? Якія траўмы, нанесеныя ў дзяцінстве дочкам, прыводзяць да скажэнняў іх асоб і лёсаў? Ці могуць маці і дачка быць сяброўкамі? Як зрабіць, каб сумны досвед не перашкодзіў дарослай дачцэ стаць паспяховай? Адказы на гэтыя пытанні дае магістр псіхалогіі **Наталі Свірыдава**.

## У ТРЭНДЗЕ — КЛАСІКА І КАМФОРТ

Світары, пуловеры, ваадалазкі, кардыганы саграваюць на працы, падчас шпацыру, у жыллі. Выбраць такі выраб, з якім зможаш стварыць розныя прывабныя вобразы з улікам ужо наяўнага гардэроба, — задача няпростая, але вельмі займальная. На што звярнуць увагу, каб гэта ўдалося? Што ў модзе гэтай восенню? Распавяла дызайнер, магістр мастацтвазнаўства, старшы выкладчык кафедры дызайну моды факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ **Марына Машэда**.

